Літаратура — наша прафесія. (Вячаслаў Адамчык)

ПЕГАС З ТОРБАЙ?

Ці змогуць беларускія пісьменнікі паразумецца з уладай?

— У крайнім выпадку дадуць нам торбу з аўсом, каб ціхенька хрумсцелі. Тым часам свядомую моладзь будуць паранейшаму збіваць і знявольваць. Хіба можна не бачыць гэтага? Саюз пісьменнікаў павінен стаць апорай для тых, хто яшчэ не адвык чытаць па-беларуску, стаць асяродкам прыстойнасці, мужнасці, урэшце — беларускасці, — сказала на XII З'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі Вольга Іпатава.

Куды ні кінь

У перадз'ездавых меркаваннях будучыня Саюза бачылася благавата. „Бачыцца яна без асаблівага шчасця, — разважаў Алег Ждан. — Без грошай, без сяброўства, без яснае мэты, без удзячных нашчадкаў, без... Добра было б, каб з'езд выпрацаваў новы змест дзейнасці. Але ж змест не выпрацоўваецца на сходзе, яго падказвае толькі само жыццё. Раней мы шукалі на пасаду старшыні чалавека сціплага, памяркоўнага, разумнага, прыемнага ва ўсіх адносінах. А трэба, відаць, — упартага, незгаворлівага, наравістага". А Павел Місько будучыню Саюза пісьменнікаў бачыў вельмі змрочнай. Чаму? „Ідэям Адраджэння, якія яшчэ колькі гадоў натхнялі і аб'ядноўвалі амаль усіх членаў Саюза і якім яны служылі, шмат хто здрадзіў, пабег не служыць, не «глаголом жечь сердца людей», а ўслугоўваць тым, хто мае ўладу, хутчэй ухапіць тлусцейшы кавалак (пакуль ёсць магчымасць). Раскол у пісьменніцкіх шэрагах вялікі (хто-ніхто задаволена заціраe рукі). Пісьменнікаў, што не вітаюцца адзін з адным, робіцца ўсё больш. Утрымаць іх надалей у адной спрэжцы будзе цяжка. Але калі з'езду ўдасца выпрацаваць адзіную агульную платформу, Саюз будзе жыць. Інакш рассыплецца на групкі, суполачкі, прападзе і той лад, што быў дасюль. Ад таго, якая каманда прыйдзе да кіраўніцтва, у многім будзе залежаць і работа, і лёс Саюза. А шэрагі СП будуць расці. Маладая генерацыя пісьменнікаў ідзе густая, і на

яе вялікія спадзеўкі. Яна і забяспечыць будучыню беларускае літаратуры".

Захаваць чалавечае і сваё

На З'ездзе, які адбыўся ў канцы красавіка 1998 г., прысутнічала 330 чалавек з 498 членаў СП, прафесійных літаратараў, літаратуразнаўцаў, публіцыстаў. Прысутнічалі таксама афіцыйныя асобы: намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Іван Пашкевіч, старшыня Дзяржкамдруку Міхал Падгайны, міністр культуры Аляксандр Сасноўскі, ад Саюза кампазітараў Ігар Лучанок, ад пісьменнікаў Расіі члены дзвюх літаратурных канкурэнтных арганізацый Васіль Бялоў, Уладзімір Бандарэнка, Ігар Ляпін (якраз ім, расійскім пісьменнікам, падзякаваў за прысутнасць Генадзь Бураўкін, ды яшчэ больш шчыра падзякаваў, пры адабрэнні цэлай залы, за дрэнны прыклад раз'ядноўвання сваіх радоў і выразна, рашуча крыкнуў: **Мы не падзелімся, не чакайце гэтага!** — рэакцыя прысутных была такая, што тыя панове, якія па палітычных і іншых прычынах звалі за разламам, будучы ў прэзідыуме, не выйшлі да трыбуны і нават слова не піснулі, каб дзяліць усё ж такі цэлае).

З дакладам выступіў Васіль Зуёнак, старшыня рады СПБ. Ён акрэсліў мэты і задачы, якія стаяць перад пісьменнікамі ў наш час: *Праца па ачышчэнні душ людскіх ад маральнай пошасці і брыдоты, малітва натхнёным словам мастака за ўратаванне боскіх пачаткаў чакае нас.* Самае галоўнае — захаваць нацыянальную самабытнасць, мову, памяць, прапагандаваць творы таленавітых беларускіх пісьменнікаў, а тым самым і духовы патэнцыял нацыі. Закрануў паэт вядомыя і балючыя справы — існаванне беларускіх школ, падтрымка выдання беларускамоўных кніг, часопісаў і газет з боку дзяржавы, перакладчыцкую дзейнасць. Трэба пашыраць прапаганду беларускай літаратуры, але, вось, у СП няма грошай на творчыя камандзіроўкі. Закрануў многія цяжкія праблемы жыцця пісьменніцкай арганізацыі, як катастрафальная сітуацыя з Домам творчасці „Іслач", які заняпаў з-за адсутнасці сродкаў. Былі ўнесены прапановы аб некаторых зменах статута, дзеля паправы таксама і фінансавай сітуацыі. Расказаў

пра гісторыю страты Дома літаратара. *Мы звярталіся ў суд, праводзілі пікеты, але нам адказвалі: «Мы навядзём парадак»*. Усе пісьменнікі лічаць, што Дом літаратара павінен быць захаваны як цэнтр творчага жыцця пісьменніцкай арганізацыі і наогул творчай інтэлігенцыі.

У дыскусіі выступіла каля 20 чалавек. Асабліва балючымі былі выступленні Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Вольгі Іпатавай, Уладзіміра Дамашэвіча аб духовым спусташэнні грамадства, аб татальнай асіміляцыі. *У духу 30-х гадоў абрушваюцца праклёны на недадушаных беларускіх «нацдэмаў»*. На думку Г. Бураўкіна, Саюз сапраўды хворы, пра што сведчыць прыём у яго апошнім часам не толькі кепскіх пісьменнікаў, але і малапісьменных людзей. Адзначыў нерашучасць былога кіраўніцтва СПБ. Звярнуў таксама ўвагу (у адказ на заўвагі І. Пашкевіча, што пісьменнікі не хочуць

размаўляць з Прэзідэнтам,

не просяцца ў яго дапамогі), што на адкрыты ліст прэзідэнту народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна так і не было ніякага адказу, што з'яўляецца паказчыкам культуры вярхоўнай улады дзяржавы: *Калі ўлада хоча, каб яе паважалі, трэба, каб яна паважала культуру народа, якім кіруе. Пакуль жа нацыянальнай культурай кіруюць чыноўнікі, раўнадушныя да яе, беларуская інтэлігенцыя не будзе заадно з урадам.*

Уладзімір Дамашэвіч спадзяецца, што мова і культура Беларусі адродзяцца, *як адраджаецца трава там, дзе з зямлі прыбіраюць каменную пліту*.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, мілавідны чалавек, някепска валодаючы беларускай мовай (ніколі не хваліцца гэтым там, дзе працуе) наракаў на тое, што пісьменнікі не папрасілі грошай на правядзенне з'езду, не хочуць паразмаўляць пра мізэрныя ганарары, што не відаць з іх боку ніякай ініцыятыўнасці, каб пасупрацоўнічаць з уладай, а прэзідэнт жа клапоціцца і аб гэтым. Не былі падтрыманы адпаведнымі сустрэчнымі ініцыятывамі прапановы мінш. па заснаванні фонду па падтрымцы стварэння твораў літаратуры і мастацтва. Раіў Іван Іванавіч, каб не ператвараць праблему пе-

радачы Дома літаратара пад апеку Адміністрацыі Прэзідэнта ў справу палітычную, бо ж падставы былі для гэтага *толькі эканамічныя і вымушаныя.*

Так што — з'езд не разваліў Саюза пісьменнікаў, хоць часткова перасварыў (ужо пасля), структуры крыху змяніліся, выбраны на старшыню рады СП чалавек энергічны, таленавіты і досыць малады — Уладзімір Някляеў. Яму і прыйдзецца размаўляць таксама і з прэзідэнтам, які гатовы пераканаць пісьменнікаў аб сваёй гатоўнасці служыць Радзіме. Хіба не такім чынам, як парламентарыяў?..

„Ніва" н-р 25 (2197) ад 21 чэрвеня 1998 г.

МІНСКЕВІЧ ПЕРАКЛАЎ МІЦКЕВІЧА

Сержука Мінскевіча, журналіста „Культуры", вядомага паэта і барда маладога пакалення сустракаем за камп'ютэрам у роднай рэдакцыі.

— Што ты, Серж, рабіў у апошні час? Чакалі мы летась цябе на Бардаўскай восені ў Бельску ды і не дачакаліся...

— Я толькі што закончыў рэдакцыйную праўку „Дзядоў" Адама Міцкевіча, якіх я пераклаў на беларускую мову. Пераклаў усе часткі, нават тыя, якія былі забароненыя цэнзурай у апошнім выданні, нават такія кавалкі, што ніколі не друкаваліся. Усё пераклаў і ўсё скампанаваў. Кніжка мае быць надрукавана з дапамогаю варшаўскіх сяброў к дню нараджэння Міцкевіча, да двухсоттоддзя. Будзе яна ў Беларусі першым камплектным перакладам на беларускую мову. Гэта ж такі твор, які выконвае нацыяхоўчую ролю і для беларусаў, і для палякаў, і для літоўцаў.

— Як табе, маладому, прыйшло ў галаву ўзяцца за такую магутную справу?

— Я працаваў старшым рэдактарам літаратурнай часткі тэатра „Зніч" у 1994 годзе з Галінай Дзягілевай, і ў час ма-

ёй працы там узнікла такая ідэя: сабраць усе часткі „Дзядоў”, якія ёсць па-беларуску перакладзены і скампанаваць паводле іх монаспектакль Тэатра аднаго акцёра „Зніч”. Але аказалася, што гэтых фрагментаў вельмі мала перакладзена, і мне давялося перакладаць яшчэ некаторыя. Гэтая п’еса не пайшла, на жаль, застаецца дзесьці ў архівах тэатра. Яна цяжкая для выканання ў тэатры аднаго акцёра. Я тады быў студэнтам. Пасля, у 1995 годзе я пераклаў яшчэ чацвёртую частку і зрабіў дыплом, вядома, даследуючы яшчэ тэкст „Дзядоў”. Кіраўніком мае працы быў Вячаслаў Рагойша. Пасля я вучыўся трошачкі ў Варшаве ў гуманітарнай школе і працягваў пераклад...

— Як ты справіўся з „Імправізацыяй”?

— „Імправізацыя” гэта самая вяршыня. Яна, дарэчы, перакладалася на беларускую мову некалькімі аўтарамі, але я думаю, што яна ў мяне някепска атрымалася, тым больш, што ёсць ужо на маю працу водгукі. Я даваў пачатаць мой пераклад прафесар Альжбеце Смулковай і іншым, хто добра ведае Міцкевіча і па-польску, і па-беларуску. Я лічу, што я захаваў укладзенае ў „Імправізацыю”. Думаю, што мне дапамагло і тое, што я больш-менш ва ўзросце Адама Міцкевіча, калі ён пісаў „Дзяды”. Можа быць, гэтую нейкую рухавасць, нейкі імпэт, пачуццёвасць удалося мне захаваць. Набокаў піша, што перакладчык павінен мімікрыраваць пад таго аўтара, якога перакладае. А я ж яшчэ быў акцёрам, і я неяк так, калі перакладаў, проста быццам пераўвасабляўся ў асобу Адама Міцкевіча, пагружаўся ў абставіны. Па-акцёрску, бо ўсё-такі гэта драма.

— Ці не выклікала тое, што гэты пераклад зрабіў якраз ты, адзін з лідэраў галоснага „Бум-бам-літа”, бард, акцёр, зусім малады хлопец, нейкага нават шоку?

— Я раней вельмі мала друкаваў плён сваіх перакладаў. Калі выйдзе кніга, пабачым, будзе шок, ці не. Самае галоўнае — мне трэба было захаваць Міцкевічаўскі радок, яго думку, вобраз, пачуццё. Прачытаўшы, як яны жылі, пра тую ноч, калі ён пісаў „Імправізацыю”, я пагрузіўся ва ўсё тое. Я той твор перакладаў ноччу. Тут жа хацелася мне яго перапісаць. Я, вядома, на камп’ютэры, Міцкевіч пісаў начыстую. Міцке-

віч думаў: хутчэй, хутчэй перапісаць, а то раптам заўтра памру і ніхто не зможа расшыфраваць!.. І ў мяне быў такі стан: хутчэй, хутчэй занатаваць!

— А што ў той час, калі працаваў над „Дзядамі", ты меў на асабістым варштаце?

— Калі перакладаеш Міцкевіча, цяжка пісаць што іншае. Але разрадка розуму патрэбная. Ідзе раптам думка ў іншы бок, і пішаш... дзіцячую песеньку. Пасля яе пад гітару спяваеш. Вось у той час я пісаў песні, выйшла касета.

— Сёлета прыедзеш на Бардаўскую восень у Бельск-Падляшскі?

— У мінулым годзе я не змог, але ў гэтым пастараюся.

— Чакаем новых песень і вершаў, Сяржук!

„Ніва" н-р 38 (2210) ад 20 верасня 1998 г.

ПАРАЗМАЎЛЯЦЬ З УЛАДАЙ

Гутарка са старшынёю Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімірам Някляевым.

Міра Лукша: Пэўна адно з першых пытанняў, якія задаюцца цяпер Вам размоўцамі — пра візіт дэлегацыі Саюза пісьменнікаў у Прэзідэнта?

Уладзімір Някляеў: І ты таксама?.. Неяк так ва ўсіх сродках масавай інфармацыі што дзяржаўных, што не, пракацілася як асноўная тэма, нібыта сустрэча з прэзідэнтам мела канчатковую мэту якраз прыдбаць нейкія матэрыяльныя сродкі. Я не скажу, што мне гэтага не хацелася, бо зараз Саюз знаходзіцца, зрэшты, як амаль усе, у складаным матэрыяльным становішчы. Галоўная мэта была ўсё ж не гэта. Пра грошы ніхто ніякай гаворкі не заводзіў. На мэце ставілася дасягнуць нейкае паразуменне ў тым, чаго хоча ўлада; ці таго ж самага хоча ўлада чаго хоча творчая інтэлігенцыя, ці нечага іншага. Калі іншага, то ў чым тое іншае заключаецца. Перш за ўсё тычылася гэта існавання сёння Беларусі і беларушчыны. Задавалася прэзідэнту пытанне, што ўлада мае на

мэце ў гэтым сэнсе; ці нейкую, як прыкідваецца часта ў друку, сацыяльную дзяржаву ці нейкую яшчэ іншую, і даводзілася, што на сённяшні дзень творчая інтэлігенцыя не бачыць альтэрнатывы для правядзення ва ўнутранай палітыцы нацыянальнай ідэі — ідэі, якая мела б аб'яднаць нацыю ў гэтыя няпростыя часы. Нельга сказаць, што з боку ўлады не было сказана, што „не лезьце з тым да нас, бо сёння нам трэба накарміць, напаіць, абагрэць" — пра гэта таксама казалася. І вось ніхто не супраць таго, каб будаваць наша грамадства на аснове нацыянальнай ідэі з усім тым што з гэтага вынікае — састаўлены адпаведныя дамовы адносна да культуры, наогул духоўнасці. Але ёсць вось нейкія перашкоды знешнія. У чым заключаюцца гэтыя знешнія перашкоды, і ў чым можа эканамічна правядзенне ў нашай палітыцы беларускай нацыянальнай ідэі можа перашкодзіць — гэта засталося трошкі няўцямным, па-мойму, як для аднаго боку, так і другога.

М. Л.: Ваша сустрэча з уладамі была па-рознаму ўспрынята асяроддзем.

У. Н.: Даволі рэзка гэты крок быў успрыняты людзьмі, якія стаяць на самым краю беларускага флангу, што гэта нібыта не трэба было рабіць, што з гэтай уладай мы нічога не можам дасягнуць, ніякага паразумення, і трэба чакаць. Ніхто не ведае і не можа сказаць, чаго чакаць. Чакаць таго, што наогул будзе парушаны нават той стан беларушчыны, які ёсць на сённяшні дзень, а ўжытак беларускай мовы становіцца ўсё меншым і пашыраецца ўплыў рускай культуры; ды якой жа культуры — папсы, псеўдакультуры — гэта ж відавочна ўсім і гэта працуе досыць энергічна. Не выпадае творчай інтэлігенцыі, тым больш пісьменнікам, чакаць і глядзець, што з гэтага вынікне! Чакаць, што нібыта гэта ўсё рухне, на гэтых абломках мы пачнем нешта новае, прыгожае, светлае рабіць. Трэба быць усё-такі рэалістам, глядзець, калі ты ўсур'ёз думаеш пра тое, што адбываецца, усур'ёз думаеш пра будучыню тае краіны, у якой жывеш. Трэба падыходзіць больш рэалістычна да абставін, у якіх знаходзішся. І той жа ўладай было сказана, канкрэтна прэзідэнтам (гэта чамусьці мала хто пачуў), што палітык, у тым ліку і прэзідэнт, гэта сістэма ўздзеянняў, кож-

ны дзень знаходзіцца пад тым ці іншым прэсам з боку адной палітычнай сілы, думкі, ідэі той ці іншай, і калі не занята тая ніша, з якой мы хацелі б уплываць на ўлады, тая ніша будзе занята іншымі сіламі, людзьмі...

М. Л.: Пра грошы сярод джэнтльменаў не было размовы...

У. Н.: Стаяла адзінае матэрыяльнае пытанне, пра што я сказаў у сваім слове — гэта лёс Дома літаратара. Я паспрабаваў пратлумачыць, што тут справа не толькі ў тым, што маёмасць страчана. Маральны бок таго што адбылося — перадача ўласнасці ў гаспадарчае ўпраўленне адміністрацыі прэзідэнта адбіваецца ва ўсёй краіне. Па раёнах, абласцях сядзяць клеркі, чыноўніцкі люд рознага ранга і маштабу, які разважае даволі проста: ага, калі пісьменнікаў сагналі з уласнае хаты ў сталіцы, то калі гэта не прамая каманда, дык ускосная не вельмі цацкацца з імі нідзе! Гэта стала праяўляцца рэальна на месцах. Зараз, калі літаратар едзе выступіць (гэта яшчэ не паўсюдна, дык былі ўжо такія выпадкі) у школе ці на прадпрыемстве, яму трэба ў раёне зайсці ў аддзел культуры, каб яму там паставілі пячатку надзейнасці, калі ў школе — у маладзёжную арганізацыю, зазвычай у Беларускі патрыятычны саюз моладзі. Гэтага не было ў нас ніколі! Такое не можа пераўтварыцца ў практыку! Ёсць істотныя на сённяшні дзень праблемы — утрыманне на нейкім больш-менш прыстойны узроўні кнігавыдавецтва беларускамоўнага і друкавання перыядычных выданняў. Выдавецтва „Мастацкая літаратура” па завядзёнцы фінансавалася ў 50% дзяржавай, 50% павінна было само зарабіць. У ранейшыя гады гэтага хапала, цяпер не. Па вельмі розных прычынах скарачаецца тыраж кніг і прыбытак за іх. Сама цікавасць да літаратуры, не толькі беларускай, падае, купляецца менш кніг. Шэраг пытанняў вось такога кшталту, якія, хочаш ці не хочаш, а вырашыць іх можна толькі ў кантакце з дзяржавай, сродкамі, якія яна на гэта выдаткоўвае. Вядома, можна нейкія праекты зрабіць аднаразова (як, напрыклад, выданне „Сьцяны” В. Быкава), як акцыі. Няма з боку структур і ведамстваў, якія займаюцца паралельна з намі пытаннямі культуры і асветы, асаблівых супярэчнасцяў з тымі пазіцыямі, з той лініяй, якую мае намер праводзіць Саюз

пісьменнікаў. Дык што тут рабіць — кантактавацца з імі, ці не? Нармальнае пытанне, калі лагічна да ўсяго таго падыходзіць. Дакладней — адказ тут просты. Каб зрабіць нейкую справу лепш і каб захаваць тое што ёсць і мець нейкую перспектыву, трэба кантактаваць з людзьмі, якія працуюць у гэтых структурах. Я не бачыў аніякай (як і не бачыў, калі мы рыхтавалі гэтую сустрэчу) шкоды. Іншая права, што з гэтага будзе вынікаць канкрэтна, таму што паабяцаць можна што заўгодна, а ўжо выконваць гэта будуць адпаведныя людзі, тыя ж чыноўнікі. Як свечыць папярэдняя сустрэча, не заўсёды абяцанае на справе рэалізоўваецца. Але гэта будзе залежаць ад таго, наколькі актыўна будзем мы дамагацца, каб папярэднія дамоўленасці былі скарыстаны і выкананы.

М. Л.: Дзякуем за размову, жадаючы, каб удалося выкарыстаць усе магчымасці дзеля паправы кандыцыі пісьменнікаў і ўсяго Сяюза, а таксама, каб Вам, як паэту, спрыяла Муза.

Запісала **Міра Лукша**

„Ніва" н-р 41 (2213) ад 11 кастрычніка 1998 г.

„БЕЗОБРАЗИЕ И БЕСПОРЯДКИ" НА ВУЛІЦАХ МІНСКА

25 сакавіка, у суботу, Беларусь святкавала Дзень Волі. Найвялікшы і святы дзень для беларускага народа. 82 гады таму была закладзена беларуская дзяржаўнасць.

Улады зрабілі ўсё, каб не дапусціць да гэтай, як казалі журналісты расійскіх тэлекампаніяў, *акцыі пратэсту*, у форме, якая адпавядала *апазіцыі*. **Ничего подобного в своей истории Минск еще не видел!** — гэтая вестка перабіла ў маскоўскіх інфармацыях нават тыя пра выбары іхняга прэзідэнта ды Чачню. — **Новый скандал в Минске!** Нічога дзіўнага, **прэвентыўна** затрыманы і жорстка пабіты былі журналісты трох расійскіх праграм, заходнія журналісты, назіральнікі, замежныя госці... Пра **апазіцыю**, сярод якіх былі

вучні і старэчы, успаміналася мімаходам — толькі ў адным месцы, як паведамляў пасля Аляксандр Калпакоў з НТВ, было затрымана каля 200 асоб, тых, каго схапілі ды павезлі ў размеркавальнік у спартыўнай зале школы МУС. Адтуль расійскіх журналістаў вызвалілі **па ўмяшальніцтве** саветніка Міністэрства ўнутраных спраў, пасля патрабавання расійскага пасла; гэта недзе пасля гадзіны. Разбіты былі тры камеры, забраны відэаматэрыялы...

Негадавалі расійскія тэлекампаніі ды чамусьці дзіваваліся, чаго ж гэта міліцыя, унутраныя войскі ды АМАП перашкаджае святкаваць народу ў час, калі прэзідэнт раніцай з'ехаў у гасціну ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. А што ў беларускай ТВ з тае нагоды? Пра гэта раскажуць пасля, па вестцы з паводкі на Палессі, пра той „гэтак званы Дзень Волі". **„Не першы раз апазіцыя выкарыстоўвае факт ад'езду прэзідэнта** за межы краіны, каб арганізаваць правакацыі... Разлік пры гэтым робіцца на тое, што пры адсутнасці прэзідэнта пасадавыя асобы могуць разгубіцца і дапусціць памылкі, якія пасля можна выкарыстаць для дыскрэдытацыі афіцыйных улад... Але ахоўнікі правапарадку не дапусцілі буйных правакацыяў. Зрабілі ўсё, каб ніхто не пацярпеў, як гэта здарылася 17 кастрычніка мінулага года. Правакатары былі нейтралізаваны. Нешматлікі мітынг адбыўся на плошчы Бангалор". „Натоўп выклікаў недаразуменне прахожых!" — лапатала сыценькая каментатарка і зачапала маладых людзей, пытаючы, ці не перашкодзіў ім **ён** праходзіць па заблакіраваных вуліцах. „Ой, вы знаете... Невозможно пройти... Хорошо, что погода хорошая..." — „Значит, пешком пришлось пройти?"— трыумфавала АТМаўская бландзіначка з мікрафонам і дадавала: „Шэраг правакатараў у большасці **ў даволі абшарпаным выглядзе**" перайшоў групкамі, са сцягамі, на „выган", дзе прапанавалі праводзіць свята. „Арганізатары мітынгу ставілі захаванне парадку ў горадзе менавіта ў сваю заслугу!"

Сапраўды, улады ўсё зрабілі, каб не было „беспорядка и безобразия", як назаўтра пракаментаваў міністр унутраных спраў. Вучні і студэнты былі абавязаны ў той дзень быць да

вечара на занятках — яшчэ і іхнім бацькам і настаўнікам трэ было абавязкова ў той дзень адбыць „суботнік” — парадкаванне тэрыторыі школ і вучэльняў. Яшчэ далёка да 12 гадзіны цэнтр горада быў заблакіраваны АМАПам, міліцыяй і ўнутранымі войскамі. На вуліцы выйшлі бронетранспарцёры і вадамёты. Міліцэйскія патрулі з сабакамі выціскалі прахожых ад бакоў плошчы Якуба Коласа. Дарожнымі машынамі быў закрыты выхад з вуліцы Янкі Купалы (удалося мне там зрабіць здымак, ды надзіў падобны на „Бацьку” дзядзька з лапатай нацэліўся быў мяне пачаставаць сваёй прыладай, убачыўшы, што фатаграфую; дарэчы, пасля выканання пару здымкаў тлумку ўцякаючага ад метро, я прымушана была схаваць свой заслужаны фотаапарат, і толькі таму ў гэты раз абмінуў мяне лёс іншых журналістаў)...

Былі перакрытыя бліжэйшыя падземныя пераходы. Зараз перад поўднем узброеныя сілы былі шматразова ўзмоцнены. Праз гукаўзмацняльнікі пачуліся гукі закліку, на беларускай мове, разысціся і не падвяргацца пасля нелегальнага сабрання „мерам пакарання” на „парушальнікаў парадку”.

Міліцыя як ніколі дагэтуль была жорсткая ў адносінах і да журналістаў. Узброеныя і ў шчыты, каскі, а нават процівагазы, спачатку затрымалі карэспандэнтаў, праверылі іх дакументы і адпусцілі пасля 10 хвілін. Пасля ўжо ведалі, на каго накідацца і лупіць дубінкамі, таксама па інструментах працы. Калі пачаліся масавыя арышты любых прысутных на плошчы, разам з „прэвентыўна” затрыманымі журналістамі толькі ў адным месцы схоплена было каля 200 асоб. Сабакі хапалі за лыткі, нацкаваныя на канкрэтных асоб, бачных трыманым сцяжком, брашуркай, хай і не „заклікаючых да правакацыі”. Калі быў схоплены старэнькі дзядуля, усе звярнулі ўвагу на яго, ды агледзішся — няма тых, што толькі стаяў побач цябе. Дзяўчынцы гадоў 16 сабака ўчапіўся за нагу, яна раскінула рукі, а тут за іх і злавілі ды павалаклі яе ў машыну... Дзвюм пажылым асобам прыйшлося аказаць медыцынскую дапамогу. Расійскія журналісты, аператары здымачных груп ОРТ, НТВ і РТР былі загнаны разам з 200 асобамі ў размеркавальнік у спартыўнай зале, адпусцілі іх недзе праз гадзіну, вярнуўшы,

пасля ўмяшання саветніка МУС, відэа-касеты без запісу і пабітыя камеры. Пратаколы не былі складзены, спісаны толькі прозвішчы карэспандэнтаў. Дарэчы, затрыманы былі яны без слова, без адказу на тое, за што іх б'юць, без падачы прычыны затрымання, затое ў размеркавальніку адносіны да іх былі „досыць карэктныя". Разам недзе ў паўтысячы дэманстрантаў затрыманы былі і заходнія журналісты, назіральнік АБСЕ, трох членаў польскага Сейма (пасля налёту на сядзібу Фронту). Сярод затрыманых апынуўся дэпутат АВС Мар'юш Камінскі, некалькі сябраў Рэспубліканскай лігі, журналістка Польскага тэлебачання Мар'я Вернікоўская і яе калегі, пабіты быў аператар. Калі вочы не бачаць...

Усё ж, недзе пад 10 тысяч мінчан удалося было дайсці да плошчы Бангалор на мітынг. Вось так улада вядзе свой „дыялог" з „апазіцыяй", г.зн. з тымі, хто мае ахвоту і адвагу адкрыць рот. З апазіцыйнымі партыямі, прафсаюзамі, моладдзю. З простымі людзьмі, якія хочуць жыць у нармальнай краіне.

Вячаслаў Сіўчык, віцэ-старшыня БНФ, верыць у тое, што на „Чарнобыльскі шлях" павінна прыйсці столькі людзей, каб улада сапраўды пабаялася. І што зноў дэманструючыя сваю волю людзі не паддадуцца правакацыям. І што пойдуць усе, не баючыся, не хаваючыся, не выстаўляючы тых найбольш актыўных і разумных адных пад дубінкі ўзброеных зомбі.

„Ніва" н-р 15 (2291) ад 9 красавіка 2000 г.